УДК 316.621

# SMART MOB ЯК ФЕНОМЕН СЕТКАВАЙ КАМУНІКАЦЫІ

***І.А. Зайцаў*** (Магілёўскі інстытут МУС РБ)
Навук. кір. ***С.В. Венідзіктаў***,
канд. філал. навук, дацэнт

Смартмоб (англ. *smart mob* – разумны натоўп) – гэта сацыяльная група з нявызначанымі межамі сяброўства, якая дзейнічае ўзгоднена, загадзя скаардынаваўшы свае дзеянні праз інфармацыйна-камунікацыйныя рэсурсы. Паняцце ўпсршыню ўжыў Г. Рэйнгольд ў кнізе «Разумны натоўп», апісваючы яго так: «Разумныя натоўпы складаюцца з людзей, здольных дзейнічаць узгоднена, нават не ведаючы адзін аднаго» (пераклад наш. – *І.З.*) [2, с. 8]. Гэта значыць, смартмоб уяўляе сабой кірусмую супольнасць, якая ўзаемадзейнічае з выкарыстаннем лічбавай прасторы, як правіла, не мае відавочнага лідэра, але звязваецца агульнымі інтарэсамі.

Паводзіны людзей у разумным натоўпе могуць адрозніваца ад звыклых: у выніку набытага пачуцця беспакаранасці і ананімнасці людзі здзяйсняюць неўласцівыя ім дзеянні, што становіцца прычынай масавых беспарадкаў, якія вынікаюць з мірных шэсцяў. Смартмоб можа існаваць таксама на віртуальным узроўні: у выглядзе супрацьпраўных дзеянняў, якія абмяркоўваюцца ў Інтэрнэце, калектыўнага назірання за падзеямі праз медыярэсурсы. «Разумны натоўп» небяспечны магчымым наўмысным скажэннем інфармацыі на карысць зацікаўленага боку. Феномен можа быць разгледжаны таксама з пазіцыі сістэм procідзеяння масавым беспарадкам, а таксама з пункту гледжання няздольнасці дзяржавы забяспечыць дастатковы кантроль за сеткавай прасторай, не парушаючы законныя інфармацыйныя правы грамадзян [1].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Уключэнне ў разумны натоўп, безумоўна, аказвае ўплыў на светапогляд і светаразуменне індывідаў, узмацняючы залежнасць ад камунікацыйных сеткавых дэвіяцый. Пры гэтым да станоўчых характарыстык смартмобу варта аднесці магчымасць калсктыўнага абмеркавання актуальных палітычных пытанняў, самаарганізацыі для вырашэння агульных сацыяльных праблем, павышэнне агульнай камунікатыўнай культуры грамадзян.

**Літаратура**

1. **Венидиктов, С. В.** Интернет-коммуникация в деятельности органов внутренних дел : учебное пособие / С. В. Венидиктов, И. В. Вашрова. – Минск : РИВШ, 2020. – 236 с.

2. **Рейнгольд, Г.** Умная толпа: новая социальная революция / Г. Рейнгольд ; пер. с англ. А. Гарькавого. – М. : ФАИР ПРЕСС, 2006. – 416 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова